выбирал наилегчайшие для себя пути, не желая понять, что это губительные пути. Самый главный закон жизни так и не был им освоен: выигрывая в одном, неизбежно проигрываешь в другом, а пожинаемое зло обратно пропорционально добру, разделенному на число людей, ожидавших помощи… <…> Никто не хотел признать, что подлинный прогресс – решения, исключающие выигрыш одних и проигрыш других или, по крайней мере, непрерывно меняющие местами выигравших и проигравших».

Таким образом, категория *пространство* в романе «Катастрофа» обеспечивает композиционно-сюжетное построение произведения. Пространство определяет жанр, образы и мотивы поведения главных героев. Художественные произведения всегда наполнены пространственными категориями, бесконечно многообразными и глубоко значимыми для понимания текста.

Литература

1. Савицкий, А. К 70-летию Э. М. Скобелева [Электронный ресурс] / А. Савицкий // Наш современник. Очерк и публицистика. – 2015. – № 12. – Режим доступа: http://nash-sovremennik.ru/p.php?y=2005&n=12&id=11. – Дата доступа: 18.10.2020.
2. Скобелев, Э. М. Катастрофа / Э. М. Скобелев. – Минск : Маст. літ., 1984. – 349 с.

Д. С. Пяцюк, Н. П. Лобань (Беларусь)

МАТЭРЫЯЛЫ ДА СЛОЎНІКА НЕАФІЦЫЙНЫХ МІКРАТАПОНІМАЎ Г. МІНСКА (КАМПРЭСІЎНАЕ СЛОВАЎТВАРЭННЕ: УНІВЕРБАЦЫЯ, АПОКАПА, АБРЭВІЯЦЫЯ)

Апошнія гады асаблівую цікавасць выклікае даследаванне неафіцыйных назваў гарадскіх мікратапанімічных аб'ектаў. З ростам і развіццём гарадоў пашыраецца колькасць неафіцыйных мікратапонімаў, а старыя, агульнавядомыя і не вельмі зручныя назвы ў вусным маўленні гарадскіх жыхароў замяняюцца на больш кароткія і запамінальныя. Сабраны матэрыял паказвае, што неафіцыйныя гарадскія мікратапонімы могуць утварацца рознымі спосабамі. Акрамя таго наспела патрэба скампанаваць увесь сабраны матэрыял і прывесці яго ў сістэму шляхам лексікаграфічнага апісання.

Мэта артыкула – на прыкладзе неафіцыйных гарадскіх мікратапонімаў горада Мінска прасачыць, як утвараюцца названыя адзінкі шляхам кампрэсіўнага словаўтварэння (універбацыі, апокапа і абрэвіяцыі), і на аснове гэтага падаць матэрыялы да Слоўніка неафіцыйных мікратапонімаў г. Мінска.

Для стварэння больш зручных і кароткіх мікратапанімічных намінацый выкарыстоўваюцца спосабы ***кампрэсіўнага словаўтварэння. Кампрэсія*** – ад лац. *compression* – сціскание. Тэрмін прыйшоў з класічнай фізікі, дзе кампрэсія – сціскание газа ў цыліндры рухавіка, паветра ў кампрэсары. У якасці лінгвістычнага тэрміна выкарыстоўваецца з пачатку 60-х гадоў XX ст. Сутнасць кампрэсіі ў мове можна раскрыць як эканомію сродкаў выражэння думкі, моўную эканомію, як закон найменшых высілкаў. У лінгвістычнай літаратуры кампрэсіўнае словаўтварэнне разглядаецца ў вузкім сэнсе, калі суадносіцца з тэрмінам універбацыя (сцяжэнне), і ў больш шырокім, калі ўключае, акрамя ўніверабацыі, яшчэ і апокапа і абрэвіяцыю як разнавіднасці такога тыпу словаўтварэння.

Універбацыя, або сцяжэнне, апокапа, або ўсячэнне каранёў, і абрэвіяцыя адносяцца да пашыраных спосабаў утварэння неафіцыйных мікратапонімаў г. Мінска.

Акрэслім першапачаткова тэрміны і паняцці.

Універбацыя (сцяжэнне, уключэнне, семантычная кандэнсацыя, эліпсіс, згортванне найменняў) (ад лац. *unus* – адзін + *verbum* – слова) – спосаб утварэння аднаго слова на аснове словазлучэння, пры якім вытворнае слова па форме суадносіцца з адным словам, а па сэнсу – з цэлым словазлучэннем: *Мед* – медыцынскі ўніверсітэт, *Пед* – педагагічны ўніверсітэт. «Большой лингвистический словарь» універбацыю акрэслівае наступным чынам: утварэнне новага слова на базе сінанімічнага яму словазлучэння [1, с. 664]. У лінгвістычнай літаратуры гэты тэрмін ужываецца як для абазначэння самога спосабу кампрэсіўнага словаўтварэння, так і для працэсу ўтварэння аднаго слова на базе атрыбутыўнага кампанента састаўной назвы, у тым ліку і з дапамогай суфіксацыі (адзначым, што самым прадуктыўным суфіксам з'яўляецца суфікс –к). Шляхам суфіксальнай універбацыі ўтварыліся, напрыклад, наступныя неафіцыйныя мікратапонімы г. Мінска: *Акадэмка* – 1. станцыя метро «Акадэмія навук», 2. Акадэмічная бібліятэка, 3. «Акадэмкніга»; *Нацыяналка* – Нацыянальная бібліятэка РБ; *Каменка* – станцыя метро «Каменная горка»; *Лагойка* – Лагойскі тракт; *Лябяжка* – Лябяжскі рынак; *Лошынка* – Лошыцкі парк; *Лужок* – мікрараён «Зялёны Луг»; *Медзік, Медун* – медыцынскі ўніверсітэт; *Педун* – педагагічны ўніверсітэт; *Чэрвенька* – Чэрвеньскі рынак; *Юбілейка* – гасцініца «Юбілейная»; *Зялёнка* – мікрараён Зялёны Луг; *Камароўка* – Камароўскі кірмаш; *Тройка* – Траецкае прадмесце; *Розачка* – перакрыжаванне вуліц Розы Люксембург і Карла Лібкнехта; *Софачка* – завулак Соф'і Кавалеўскай. Наватворы з іншымі суфіксамі: *Кулёк* – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтва; *Каменьчыкі* – рэстаран «Каменная кветка»; *Радзік* – крама «Радзівілаўскі»; *Валадарка* – астрог па вуліцы Валадарскага, вуліца Валадарскага; *Пятроўка* – станцыя метро «Пятроўшчына», *Ангарка* – раён вуліцы Ангарскай; *Магілёўка* – станцыя метро «Магілёўская», *Жданікі* – кірмаш «Ждановічы».

Апокапа (ад грэч. *apokope* – адсячэнне) – спосаб утварэння новых слоў шляхам скарачэння, адсячэння на канцы слова аднаго або некалькіх ненаціскных гукаў пры захаванні значэння гэтага слова. У слоўніку В.Д. Старычонка ***апокапа*** вызначаецца як адпадзенне аднаго ці некалькіх гукаў у канцы слова [1, с. 62]. Гэтым спосабам утварыліся наступныя мікратапонімы: *Мед* – медыцынскі ўніверсітэт; *Мак* – Макдональдс; *Альшэва* – вуліца Альшэўскага; *Жданы* – кірмаш «Ждановічы»; *Каржы* – раён вуліцы Каржанеўскага; *Курасы* – мікрараён «Курасоўшчына»; *Масюкі* – мікрараён Масюкоўшчына; *Рубель* – крама «Рублёўскі»; *Сухары* – мікрараён «Сухарава»; *Маякоў* – вуліца Маякоўскага; *Філа, Філара* – філармонія, а таксама пляцоўка перад філармоніяй і інш.

Побач з названымі спосабамі вылучаецца яшчэ ***ўсячэнне каранёў і фанетычная (гукавая) асацыяцыя***: *Мяса* – вуліца Мяснікова; *Мяса* – корпус БДПУ на Мяснікова; *Магіла* – корпус БДПУ на Магілёўскай, *Малібу*, *Малява* – мікрараён «Малінаўка».

Абрэвіяцыя (ад лац. *abbreviare* – скарачаю) – спосаб утварэння абрэвіятур (складанаскарочаных слоў). Слоўнік В. Д. Старычонка падае гэты тэрмін з наступным значэннем: спосаб утварэння новых слоў шляхам скарачэння, усячэння і зліцця пачатковых літар (гукаў) усіх слоў зыходнага словазлучэння або іх асобных частак і цэлага слова [1, с. 12]. Складовая і ініцыяльная абрэвіяцыя стала асновай для ўзнікнення наступных найменняў: *ЯКІ, ЯК* – станцыя метро «Плошча Якуба Коласа»; *Аўтаз* – станцыя метро «Аўтазаводская»; *Казлабродская* – вул. Казлова і Даўгабродская (адна з'яўляецца лагічным працягам другой); *Макдак, Макдон* – сетка рэстаранаў «Макдональдс», *Каза* – канцэртная зала «Мінск» і інш.

З улікам адзначанага, неафіцыйныя гарадскія мікратапонімы, утвораныя шляхам кампрэсіўнага словаўтварэння, могуць быць пададзеныя ў Слоўніку наступным чынам:

***Акадэ'мка**, -і, ж.* 1. Станцыя метро «Акадэмія навук» (сін.: *Укусі' мяне', паву'к*). 2. Акадэмічная бібліятэка. 3. Кнігарня «Акадэмкніга». Назва, утвораная спосабам кампрэсіўнага словаўтварэння (універбацыя (сцяжэнне) + суфіксацыя).

***Анга'рка**, -і, ж.* Вуліца Ангарская. Назва, утвораная спосабам кампрэсіўнага словаўтварэння (універбацыя (сцяжэнне) + суфіксацыя).

***Валада'рка**, -і, ж.* 1. Астрог па вуліцы Валадарскага. Назва, утвораная спосабам кампрэсіўнага словаўтварэння (універбацыя (сцяжэнне) + суфіксацыя). 2. Вуліца Валадарскага. Назва, утвораная спосабам кампрэсіўнага словаўтварэння (універбацыя (сцяжэнне) + суфіксацыя).

***Зялёнка**, -і, ж.* Мікрараён «Зялёны Луг». Назва, утвораная спосабам кампрэсіўнага словаўтварэння (універбацыя (сцяжэнне) + суфіксацыя).

***Камаро'ўка**, -і, ж.* Камароўскі рынак. Назва, утвораная спосабам кампрэсіўнага словаўтварэння (універбацыя (сцяжэнне) + суфіксацыя).

***Ка'менка**, -і, ж.* Станцыя метро «Каменная горка». Назва, утвораная спосабам кампрэсіўнага словаўтварэння (універбацыя (сцяжэнне) + суфіксацыя).

***Лаго'йка**, -і, ж.* Лагойскі тракт. Назва, утвораная спосабам кампрэсіўнага словаўтварэння (універбацыя (сцяжэнне) + суфіксацыя).

***Ло'шынка**, -і, ж.* Лошыцкі парк. Назва, утвораная спосабам кампрэсіўнага словаўтварэння (універбацыя (сцяжэнне) + суфіксацыя).

***Лябя'жка**, -і, ж.* Лябяжы рынак. Назва, утвораная спосабам кампрэсіўнага словаўтварэння (універбацыя (сцяжэнне) + суфіксацыя).

***Магілёўка**, -і, ж.* Станцыя метро «Магілёўская». Назва, утвораная спосабам кампрэсіўнага словаўтварэння (універбацыя (сцяжэнне) + суфіксацыя).

***Макда'к, Макдо'н**, -а, м.* Сетка рэстаранаў «Макдональдс». Назва ўтворана спосабам кампрэсіўнага словаўтварэння (абрэвіяцыя).

***Мед, Ме'дзік, Ме'дун,** -а, м.* Медыцынскі ўніверсітэт. Назва, утвораная спосабам кампрэсіўнага словаўтварэння (апокапа), (універбацыя (сцяжэнне) + суфіксацыя).

***Ра'дзік**, -а, м.* Крама «Радзівілаўскі». Назва, утвораная спосабам кампрэсіўнага словаўтварэння (універбацыя (сцяжэнне) + суфіксацыя).

***Рубе'ль,** -я, м.* Крама «Рублёўскі». Назва, утвораная спосабам кампрэсіўнага словаўтварэння (апокапа).

***Сухары'**, -оў.* Мікрараён «Сухарава». Назва, утвораная спосабам кампрэсіўнага словаўтварэння (апокапа).

***Фі'ла, Філа'ра**, -ы, ж.* 1. Філармонія. 2. Пляцоўка каля філармоніі. Назва, утворана спосабам кампрэсіўнага словаўтварэння (апокапа).

Такім чынам, кампрэсіўнае словаўтварэнне (універбацыя, апокапа, абрэвіяцыя) выступае ў якасці прадуктыўнага тыпу словаўтварэння неафіцыйных гарадскіх мікратапанімічных найменняў. Назвы, утвораныя пералічанымі спосабамі кампрэсіўнага словаўтварэння, вылучаюцца сваёй канатацыйнай афарбоўкай, яркай унутранай формай. Многія з іх маюць дадатковае пераноснае, метафарычнае значэнне. Адлюстраванне такіх найменняў у Слоўніку неафіцыйных мікратапонімаў г. Мінска, на нашу думку, павінна абавязкова ўключаць тлумачэнне адносна іх спосабу ўтварэння, яго спецыфікі.

Літаратура

1. Старичёнок, В. Д. Большой лингвистический словарь / В. Д. Старичёнок. – Ростов н/Д : Феникс, 2008. – 811 с.